Ірына Голубева

начальнік аддзела навукова-метадычнага забеспячэння інавацыйнага развіцця сферы культуры ДУА «Інстытут культуры Беларусі» (г. Мінск, Беларусь)

# Асноўныя напрамкі дзяржаўнага рэгулявання ў сферы культуры ў Рэспубліцы Беларусь у кантэксце еўрапейскай стратэгіі падтрымкі культурнай разнастайнасці

У пачатку XXI ст. супярэчлівыя наступствы культурнай глабалізацыі, медыялізацыі культуры і іншых выклікаў, якія закранаюць пытанні існавання нацыянальных культур і захавання нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці, абумовілі неабходнасць не толькі тэарэтычнага асэнсавання гэтай праблемы, але і выпрацоўкі стратэгіі і прыняцця практычных мер на ўзроўні нацыянальных дзяржаў і сусветнай супольнасці для забеспячэння пэўнага балансу паміж вектарамі культурнага развіцця. Супярэчлівасць заключаецца ў тым, што, з аднаго боку, культурная глабалізацыя можа прывесці да страты нацыянальнай ідэнтычнасці праз перайманне каштоўнасцей іншаземных культур за кошт шырокага распаўсюджвання масавай культуры, а з другога боку, менавіта культурная глабалізацыя спрыяе пашырэнню культурнага абмену, актывізуе інтарэс да сусветнай спадчыны і развіцця міжкультурнага дыялогу.



Базавымі дакументамі, у якіх сфармулявана стратэгія еўрапейскай супольнасці ў дачыненні да нацыянальных культур, сталі Усеагульная дэкларацыя аб культурнай разнастайнасці, прынятая на 31-й сесіі Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА (Парыж, 2 лістапада 2001 г.) (далей — Дэкларацыя) [2] і Канвенцыя ЮНЕСКА аб ахове і заахвочванні разнастайнасці форм культурнага самавыяўлення, прынятая на 33-й сесіі Генеральнай канферэнцыі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (Парыж, 20 кастрычніка 2005 г.) (далей — Канвенцыя) [5].

Беларусь зрабіла важны крок, далучыўшыся да гэтых дакументаў, бо такім чынам узяла на сябе абавязацельствы ажыццяўляць культурную палітыку ў адпаведнасці з іх асноўнымі палажэннямі і прынцыпамі, гарантаваць падтрымку культурнай разнастайнасці і правы для ўсіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

суб'ектаў культурнай дзейнасці на культурнае самавыяўленне, не дапускаць дыскрымінацыі па гендэрных, этнічных, рэлігійных і іншых сацыяльна-дэмаграфічных прыкметах.

У рамках Канвенцыі культурная разнастайнасць разумеецца як «разнастайнасць форм, з дапамогай якіх культуры груп і супольнасцей знаходзяць сваё выяўленне. Культурная разнастайнасць выяўляецца не толькі праз прымяненне розных сродкаў, з дапамогай якіх культурная спадчына чалавецтва вылучаецца, пашыраецца і перадаецца дзякуючы разнастайнасці форм культурнага самавыяўлення, але і праз розныя віды мастацкай творчасці, а таксама вытворчасці, распаўсюджвання, размеркавання і спажывання прадуктаў культурнага самавыяўлення, незалежна ад сродкаў і тэхналогій, якія выкарыстоўваюцца» (перакл. — *І.Г.*) [5].

У Беларусі мадэль кіравання, якая склалася ў сферы культуры, характарызуецца тым, што дзяржава, застаючыся рэгулятарам грамадскіх адносін ва ўсіх сферах жыцця і адным з асноўных суб'ектаў культурнай дзейнасці, на сённяшні дзень з'яўляецца таксама галоўным спонсарам і мецэнатам культуры, бо менавіта яна распараджаецца асноўнымі фінансавымі, матэрыяльна-тэхнічнымі і кадравамі рэсурсамі.



Дзяржаўнае рэгуляванне ў сферы культуры ў кантэксце еўрапейскай стратэгіі падтрымкі культурнай разнастайнасці ажыццяўляецца па некалькіх напрамках, асноўнымі з якіх можна выдзеліць наступныя: стварэнне нарматыўнай прававой базы, падтрымка дзейнасці арганізацый культуры, калектываў мастацкай творчасці, стварэнне ўмоў для развіцця міжкультурнай камунікацыі ў грамадстве, падтрымка культурнай дзейнасці нацыянальных супольнасцей на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і суайчыннікаў за мяжой, забеспячэнне даступнасці тавараў і паслуг культуры.

У галіне заканадаўства ў сферы культуры ў Беларусі зроблены істотны крок — распрацаваны і прыняты ў першым чытанні Кодэкс Рэспублікі Беларусі аб культуры, у які ўключаны нормы больш за 60 нарматыўных прававых актаў рознай юрыдычнай сілы (7 законаў, 4 указы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, каля 20 пастаноў урада і каля 30 нарматыўных прававых актаў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь) [6]. Кодэкс павінен «стварыць спрыяльныя прававыя ўмовы для развіцця ўсіх відаў дзейнасці ў сферы культуры, а таксама даступнасці, якасці і разнастайнасці паслуг, якія прадастаўляюцца арганізацыямі культуры ў новых эканамічных умовах, у тым ліку шляхам карэкціроўкі механізма прававога рэгулявання асобных грамадскіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адносін у сферы культуры, …закласці асновы прававога рэгулявання дзяржаўна-прыватнага партнёрства ў сферы культуры, а таксама рэгламентацыі правоў этнічных беларусаў і суайчыннікаў, якія пражываюць за рубяжом, у мэтах захавання культурных сувязей з гістарычнай радзімай» [4]. Але і існуючая сёння нарматыўная прававая база (у першую чаргу Закон Рэспублікі Беларусь «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь» (ад 4 чэрвеня 1991 г.), указы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «О некоторых вопросах осуществления физическими лицами ремесленной деятельности» (ад 16 мая 2005 г. № 225), «О поддержке отдельных организаций культуры» (ад 3 верасня 2010 г. № 457), «О некоторых вопросах налогообложения в сферах культуры и информации» (ад 14 красавіка 2011 г. № 145) і інш., дзяржаўныя праграмы «Культура Беларусі» на 2011—2015 гады, «Замкі Беларусі» на 2012—2018 гады, «Беларусы ў свеце» на 2013—2015 гады, адраджэння тэхналогій і традыцый вырабу слуцкіх паясоў і развіцця вытворчасці сувенірнай прадукцыі «Слуцкія паясы» на 2012—2015 гады), стварае спрыяльныя прававыя і арганізацыйныя ўмовы для ажыццяўлення культурнай дзейнасці ў рамках Дэкларацыі і Канвенцыі. Між тым, варта пагадзіцца са спецыялістамі, якія лічаць, што праблема забеспячэння гарантый для культурнага самавыяўлення заключаецца не столькі ў галіне заканадаўства ў сферы культуры, колькі ў іншых абласцях права і практыцы прымянення яго норм [7].



Найважнейшым напрамкам дзяржаўнага рэгулявання ў сферы культуры з’яўляецца падтрымка арганізацый культуры, калектываў мастацкай творчасці на прафесійнай і непрафесійнай аснове. У Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляе сваю дзейнасць каля 7 тыс. арганізацый культуры, у якіх працуе больш за 64 тыс. чалавек. Аб’ём бюджэтных сродкаў на ўтрыманне і развіццё сферы культуры штогод складае 300—350 млн долараў ЗША. Творчая актыўнасць арганізацый культуры і калектываў мастацкай творчасці штогод характарызуецца значнай колькасцю мерапрыемстваў — прыкладна 8 тыс. спектакляў, 6 тыс. канцэртаў, 4 тыс. музейных выставак, 580 тыс. клубных мерапрыемстваў і г.д. [1].

Аднак, трэба адзначыць, што на сённяшні дзень у Беларусі, як і ў некаторых іншых краінах, практычна адсутнічае навукова абгрунтаваная ацэнка эфектыўнасці дзейнасці арганізацый культуры і прынятых дзяржавай мер у сферы культуры з пункту гледжання ўплыву на культурнае развіццё ў адпаведнасці з еўрапейскай стратэгіяй падтрымкі культурнай разнастайнасці. Такая сітуацыя ў той ці іншай ступені абумоўлена існуючай сёння сістэмай колькасных паказчыкаў культур-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

най дзейнасці. Неабходнасць не проста дасягнення, а нарошчвання гэтых паказчыкаў вымушае дзяржаўныя арганізацыі культуры інтэнсіфікаваць сваю дзейнасць менавіта па тых кірунках, якія кантралююцца данымі дзяржаўных статыстычных назіранняў. Колькасныя паказчыкі з'яўляюцца галоўнымі ў вызначэнні эфектыўнасці выканання дзяржаўных (рэспубліканскіх, рэгіянальных) і галіновых праграм развіцця культуры, тады як сістэма якасных паказчыкаў не распрацавана.

Важным напрамкам дзяржаўнага рэгулявання ў кантэксце еўрапейскай стратэгіі падтрымкі культурнай разнастайнасці, з'яўляецца міжнароднае культурнае супрацоўніцтва. Рэспубліка Беларусь удзельнічае ў праграмах і праектах міжнародных арганізацый, якія працуюць у сферы культуры: ААН, ЮНЕСКА, Савет Еўропы, Міжнародны савет музеяў і інш. Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь аказвае падтрымку творчым аб'яднанням суайчыннікаў замежжа (перадаюцца беларускія нацыянальныя касцюмы, апаратура, літаратура, музычныя інструменты і рэпертуарныя зборнікі; ажыццяўляецца абмен прадуктамі і паслугамі культуры), а таксама нацыянальна-культурным аб'яднанням прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей, што пражываюць у Беларусі. Актуальным для дзяржавы ў гэтым кантэксце застаецца стварэнне спрыяльных прававых, арганізацыйных і сацыяльна-эканамічных умоў для фарміравання ў беларусаў замежжа матывацыі на больш актыўны ўдзел у культурнай дзейнасці, выкарыстанне патэнцыялу дыяспары ў наладжванні міжкультурнай камунікацыі, прасоўванні беларускай культуры ў сусветную культурную прастору.

Змены адбываюцца ў адносінах дзяржавы і грамадства да захавання і развіцця нацыянальнай беларускай культуры ва ўсіх яе праявах — фальклоры, народных мастацкіх рамёствах, звычаях, абрадах. Дзяржаўная палітыка ў гэтай сферы рэалізуецца праз інфармацыйную і фінансавую падтрымку дзейнасці народных майстроў, гурткоў і аматарскіх аб'яднанняў, стварэнне ўстаноў культуры новага тыпу (дамоў/цэнтраў рамёстваў, дамоў/цэнтраў фальклору, дамоў народнай творчасці), падтрымку фестывальнага руху. На афіцыйным узроўні нематэрыяльныя праяўленні творчасці чалавека, асобныя відаў рамёстваў, народных майстроў і цэнтраў народнага мастацтва і рамёстваў прызнаныя ў якасці нацыянальнага здабытку, які патрабуе абароны і падтрымкі.

У апошнія дзесяцігоддзі адзначаецца актывізацыя партнёрскіх зносін паміж дзяржавай, бізнесам і грамадскімі арганізацыямі па пытаннях культуры. У 2014 г. на рэалізацыю такіх культурных праектаў, як Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад», форум тэатральнага мастацтва

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«ТэАрт», Міжнародны фестываль Юрыя Башмета, выставачны праект «Дзесяць вякоў мастацтва Беларусі» арганізатарам мерапрыемстваў аказана спонсарская дапамога ў памеры каля 12,7 млрд рублёў [1, *24*]. На пашырэнне такога супрацоўніцтва накіраваны Закон Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве», які прыняты ў 2015 г. У якасці прыкладаў развіцця партнёрскіх сувязей паміж дзяржаўнымі і недзяржаўнымі арганізацыямі, мясцовымі ўладамі можна назваць рэалізацыю такіх праектаў, як Фестываль вулічных тэатраў, музей «Прастора Суціна» ў Смілавічах, «Музей Чэслава Немена ў Старых Васілішках» і шэраг іншых.

У Беларусі створаны прававыя ўмовы для ўдзелу інстытутаў грамадзянскай супольнасці ў выпрацоўцы і абмеркаванні стратэгічных і праграмных дакументаў у сферы культуры і культурнай палітыкі. Грамадскія рады, камітэты, камісіі ў розных галінах культуры маюць права ўдзельнічаць у выпрацоўцы і прыняцці рашэнняў па пытаннях культуры. На жаль, іх актыўнасць недастаткова высокая, каб казаць аб рэальным уплыве на сучасную культурную палітыку, але прыклады такога ўдзелу сведчаць аб станоўчай тэндэнцыі ў гэтым кірунку.



Дзяржава прадпрымае і іншыя меры ў межах прынцыпаў і мэт еўрапейскай стратэгіі падтрымкі культурнай разнастайнасці ў розных галінах — аховы гісторыка-культурнай спадчыны, кінематаграфіі, музейнай і бібліятэчнай справы, клубнай дзейнасці, народных мастацкіх рамёстваў, творчай дзейнасці на прафесійнай і непрафесійнай (аматарскай) аснове, фестывальнага руху, інфарматызацыі сферы культуры і інш. Але застаюцца такія сферы, якія патрабуюць большай увагі — гэта сфера беларускай мовы і сфера адукацыі, у тым ліку мастацкай (пашырэнне нацыянальна-культурнага кампаненту ў адукацыйным працэсе). Матэрыялы некаторых этнасацыялагічных даследаванняў паказваюць, што веданне нацыянальнай мовы дае яе ўладальнікам псіхалагічныя перавагі, якія ўплываюць на ацэнкі становішча ў грамадстве, ступень задаволенасці ім, сацыяльны настрой [3], што вельмі важна ва ўсіх сэнсах, асабліва з пункту гледжання захавання грамадзянскай згоды, талерантнасці, свабоды культурнага самавыяўлення.

Такім чынам, можна адзначыць, што дзяржаўнае рэгуляванне ў галіне падтрымкі культурнай разнастайнасці ў Рэспубліцы Беларусь ставіць на мэце як захаванне традыцыйных інстытутаў і традыцыйных форм культуры, так і стымуляванне культурнага развіцця ў напрамку большага ўплыву на эканоміку і сацыяльную сферу праз уцягванне розных груп насельніцтва ў культурную дзейнасць, што знаходзіцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў рэчышчы асноўных палажэнняў еўрапейскай стратэгіі і палітыкі ў сферы культуры.

*Спіс выкарыстаных крыніц*

1. Беларуская культура–2014 : стан, тэндэнцыі і перспектывы развіцця / Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, ДУА «Інстытут культуры Беларусі»; уклад. : А. Р. Гуляева, І. Б. Лапцёнак ; рэдкал.: Б. У. Святлоў (старш.) [і інш.]. — Мінск : Інбелкульт, 2015. — 420 с.

2. Всеобщая декларация ЮНЕСКО о культурном разнообразии [Электронный ресурс]. — Режим доступа : http://www.un.org/ru/documents/decl_conv/declarations/pdf/decl_diversity.pdf. — Дата доступа : 25.10.2015.

3. *Габдрахманова, Г. Ф.* Адаптация этнических групп к социально-экономическим преобразованиям как фактор интеграции российского общества [Электронный ресурс] / Г. Ф. Габдрахманова // Автореф. дисс. … д-ра соц. наук. — Режим доступа : http://www.isras.ru/files/file/avtoreferat/avtoreferat_gabdrakhmanova.pdf. — Дата доступа : 02.12.2015.

4. Канцэпцыя праекта Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : http://www.kultura.by/page/kantseptsyya-praekta-kodeksa-respubl-k-belarus-ab-kultury. — Дата доступу : 24.11.2015.

5. Конвенция об охране и поощрении разнообразия форм культурного самовыражения [Электронный ресурс]. — Режим доступа : http://unesdoc.unesco.org/images/0014/001429/142919r.pdf. — Дата доступа : 25.10.2015.

6. Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : http://kultura.gov.by/. — Дата доступу : 07.12.2015.

7. Мониторинг реализации в Беларуси Конвенции ЮНЕСКО об охране и поощрении форм культурного самовыражения [Электронный ресурс]. — Режим доступа : http://cet.eurobelarus.info/files/userfiles/5/CET/2015_Convention_UNESCO-Monitoring.pdf. — Дата доступа : 24.11.2015.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ